Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 32 Вільня, Чацьвер 15 Кастрычніка 1931 г. Год VII (XV)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрас Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Дзе прычыны ліха?

Польскія віленскія газэты вельмі часта пішуць аб цемнаце беларускай вёскі, аб яе культурным заняпадзе, падаюць пры гэтым факты, якія маюць сьведчыць аб зьдзічэньні нашай вёскі, як падпалы, забойствы, грабеж, бандытызм, а асабліва нажоўшчына і крывавыя бітвы пасярод моладзі, а апошнім часам і бязбожніцтва. Шукаючы прычыны гэтых сумных зьявішчаў, польская прэса падае: упадак уплываў духавенства, якое не стаіць на вышыні сваей годнасьці і заданьня; пасьляваеннае непашанаваньне дабра, здароўя і жыцьця людзкога; уплывы бальшавізму, як і пры помачы сваіх ячэяк руйнуе душу народу і г. п.

Трэба прызнаць, што гэтыя прычыны ёсьць часам справядлівыя і маюць фактычную падставу. Але ёсьць яшчэ іншыя, аб якіх польская прэса маўчыць, а пры яе маўчаньні ўсе заклікі да папраўы маральнага палажэньня нашай вёскі астаюцца фальшывымі, няшчырымі і астаюцца голасам крычачага ў маральнай інтэлектуальнай пустыні нашага краю. Бо хто мае папраўляць? Польскае духавенства? Але-ж яно, нават паводле польскай прэсы, згубіла ўсякі ўплыў і кантакт з беларускімі масамі. Урадоўцы або паны? Але-ж кожны разумее, як далёка ад народу стаяць сяньня паны і як ня любімыя ёсьць урадоўцы за ўсялякі прымус і спаганяньне літары закону. Дык хто-ж мае заняцца працай над народам? Вот у гэтым і ўся справа, што працаўнікоў тых няма: яны або самі адышлі ад гэтага народу, або прымушаны былі адыйсьці.

Калі мы прыглядзімся да сяньняшняй палітыкі кіруючых у нашым краі кругоў, то пабачым, што гэтыя кругі праводзяць сыстэматычна плян адсованьня беларускіх інтэлігентных сіл ад уплываў на вёску. Беларускае каталіцкае духавенства паразсыланае па польскіх парафіях, дзе чуецца чужым, а на мейсца яго прысланы такі самы чужынец для беларускага народу — ксёндз паляк. Аб праваслаўным духавенстве тут няма чаго і гаварыць: пасярод яго вельмі мала ідэйных адзінак і яно выглядае ласкі ад гэтых кіраўнічых кругоў. Беларускія вучыцялі ў беларускую вёску не дапускаюцца, а калі дзе які вучыцель-беларус і знойдзецца ў беларускай вёсцы, то ён пазбаўлены ўсякай магчымасьці праводзіць беларускую работу. Словам, беларуская інтэлігенцыя, якая па характары сваей працы (духоўныя і вучыцялі) павінны быць найбліжэй да свайго народу, адсунуты якнайдалей. Такім парадкам праводзіцца ўжо ад некалькіх гадоў пляновая акцыя денацыяналізацыі беларускага народу і гэтым самым даецца грунт для ўсякай іншай акцыі.

Недахват нацыянальнага ўзгадаваньня стаў прыгожым грунтам для бальшавіцкай акцыі, для бязбожніцтва, сэктанства і г. д. Ані паліцыя, ані каталіцкае духавенства, ані праваслаўнае ня можа спыніць гэтай акцыі, бо ўсе гэтыя дзейнікі, змагаючыся з беларускай нацыянальнай работаю, часам нават нясьвядома прычыняюцца да пашырэньня і бязбожніцтва і бальшавізму. Гэтае ліха можна было-б спыніць толькі ўзгадаваўча — нацыянальнаю і ўсьведамляючаю акцыяй, якая ішлаб з здарова-нацыянальных беларускіх кругоў.

Каб яшчэ болей выясьніць тым лічаным польскім адзінкам, якія сапраўды бяруць да сэрца ўпадак нашага „тутэйшага“ народу, мы паставім такое пытаньне: што было-б з польскім народам, каб ён знайшоўся цяпер у такіх самых абставінах і варунках, як народ беларускі? Каб ад яго аднялі яго школьніцтва, каб наслалі іншага духавенства, каб недапускалі да яго свае інтэлігенцыі? Мусіць, замест адказу, толькі жах прайшоў-бы па целе лепшых польскіх адзінак на сам успамін аб гэтакіх варунках — бо і сапраўды, трэба жахнуцца падумаўшы аб такіх варунках народнага жыцьця.

А цяпер некалькі слоў у справе моладзі. Наша поўная энэргіі моладзь, ня маючы ніякіх вышэйшых ідэалаў, імкнецца выладаваць сваю энэргію ў бойках і ўсялякага роду распусьце. Яна шчапае галовы сваім равесьнікам на вечарынах, вясельлях і фэстах, яна не паважае нікога з старэйшых, нават сваіх бацькоў, яна адносіцца з ненавісьцяй да духавенства, бяручы часта яго за адно з рэлігіяй.

Каб выкараніць гэтае ліха мала будзе ўжыць спосабаў паліцыйных і, сказаўбы, казённа-рэлігійных, тут трэба нечага іншага: **тут трэба культурна-асьветнай працы ў роднай беларускай мове,** якой не вядзе ані дзяржаўная, ані касьцельная ці царкоўная ўлада. Усе іхныя стараньні і натугі ісьці ў наш народ з сьветачам чужой культуры, прыходзяць, як бачым, да жахлівых насьледкаў. Моладзь хоча ідэалаў, але ідэалаў такіх, якія яна магла-б адчуць, зразумець і праняцца імі. Даць ёй такія ідэалы і паказаць дарогу да іх можа толькі свая інтэлігенцыя: свае вучыцялі і свае духаўнікі, якія заўсёды паміж народу і з народам.

Культурна-асьветную работу на вёсцы могуць павесьці толькі такія асобы, якім вёска верыць і за якімі можа пайсьці. Усе спробы польскага ці расейскага духавенства, спробы асаднікаў і ўрадоўцаў, спробы паноў і польскіх вучыцялёў праводзіць культурную працу не прынясуць ніякай карысьці, **бо вёска ім ня верыць,** як работнікам казённым. Селянін інстынктоўна адчувае, што яны ў гэтай рабоце маюць свае пабочныя мэты.

Дык далейшая палітыка кіруючых дзейнікаў у нашым краі, вядучая да ізаляцыі беларускіх масаў ад роднай інтэлігенцыі і ад беларускай культурна-прасьветнай работы можа прывесьці да непажаданых рэзультатаў: да поўнай анархіі беларускай вёскі ў жыцьці грамадзкім, рэлігійным і народным. Мы ня хочам падазраваць, каб гэтакая палітыка была мэтай польскіх кіруючых кругоў у нашым краі.

Неабходнасьць рэлігійнага злучэньня на Беларусі.

Хутчэй ці пазьней хрысьціяне цэлага сьвету злучацца ў вадну вялікую сям'ю, так як гэта было на пачатку яго існаваньня. Да гэтага злучэньня прымусіць хрысьціян калі не праўдзівая набожнасьць, то жалезная канечнасьць, каб бараніцца пад павадырствам аднаго найвышэйшага пастыра злучанымі сіламі прад супольным ворагам бязьверра. Што злучэньне верных Хрысту наступіць мусіць мы знаем са слоў самога Хрыстуса, каторы выразна сказаў, што настане час, калі будзе „адзін пастыр і адна аўчарня“.

Ідучы за гэтым голасам нашы продкі ў 1596 годзе злучыліся ў вадну вялікую хрысьціянскую сям'ю на Беларусі еднасьцю веры і ўлады і гэтым выпаўнілі волю Хрыста і ўзмацавалі свае сілы, каб змагацца супольна з бязьверрам і сэктанствам. Гэта еднасьць рэлігійная ці ўнія была на Беларусі блізу 300 лет. Была-б гэта вялікая і сьвятая рэч і далей, каб не завідзілі праціў яе нашы суседзі. Сусед з Захаду хацеў выкарыстаць унію дзеля сваіх мэтаў палітычных, каб нас апалячыць, а сусед з усходу пастанавіў нас абмаскаліць. Каб гэта ўсходняму нашаму суседу лягчэй удалося, пачаў ён бяз міласэрдзя і з дзікаю заўзятасьцю вішчыць унію, каторая яму была перашкодаю ў абмаскаленьню нас Беларусаў. Ніштчачы унію ён дзяліў дзяцей аднэй Маткі Беларусі на дзьве варожыя сабе сілы і тым самым выкапаў паміж намі пропасьць рэлігійнай варожасьці, а часта і ненавісьці. Гэта пропасьць яшчэ больш павялічылась, калі ворагі нашы з усходу і заходу ўшчапілі ў сэрцы беларусаў каталікоў польскасьць, а беларусам праваслаўным расейскасьць і стварылі ўзаемную ненавісьць. І наш слаўны некалі народ з такою пропаснаю ранаю ў грудзёх, як той ранены арол заняпаў у цемру ночы рэлігійнай, народнай і палітычнай.

Дык замёрла жыцьцё на Беларусі, бо перасталі біцца сэрцы яе дзяцей узаемнай любасьцю. Аж тут за нашых ужо часоў пачуліся громы, задрыжала зямля, як град пасыпаліся кулі— і ноч праясьнілася, бо сонца сьведамасьці народна беларускай узышло на горызонце Беларусі, а пад праменьнямі гэтага сонца пачалі перапаліваца путы штучна і сілай навязанай беларусам расейскасьці і польскасьці.

Народная сьведамасьць беларуская пачала лучыць Беларусаў каталікоў і праваслаўных у адну сям'ю народна беларускую, але да ўсестароннага і супольнага злучэньня іх стаіць на перашкодзе падзел рэлігійны. Як сьведамасьць беларуская народная засыпае пропасьць раздзелу народнага, так рэлігійная засыпе пропасьць раздзелу рэлігійнага. Дзеля гэтага, каб ня было паміж намі раздзелу, мы мусімо вярнуцца да вялікай і сьвятой ідэі ўніі нашых продкаў, у сэрцах каторых яна зьявілася, а што яна карысная для нашага народу, то найлепшым доказам ёсьць тое, што нашы ворагі яе знішчылі і цяпер перашкаджаюць у яе адраджэньні.

Унія, калі стане на грунт народна беларускі і станецца для Беларусі як душа для цела, яна для нас ня толькі не страшная, але нават неабходная.

Гэта будзе вера, якой ня змогуць выкарыстаць ані суседзі з захаду, ані з усходу дзеля сваіх мэтаў палітычных, бо будзе стаяць ім на перашкодзе беларускасьць. А на грунт беларускі ўнія м у с і ц ь узыйсьці, бо ўнія на Беларусі толькі такая ў нашых часах ёсьць і магчыма.

Доказам гэтага можа нам служыць то, што толькі там у нас разьвіваецца ўнія, дзе яна стала на грунт народны, а там, дзе яна праводзіцца ў расейшчыне, ці неразлучна з польшчынай, яна ніякага пасьпеху ня мае. Яшчэ-ж хутчэй стане на свой уласны грунт унія, калі возьмуцца яе праводзіць народныя сьвядомыя сыны Беларусі, а гэта прыйсьці мусіць і то ў хуткім часе, бо гэтага вымагае само жыцьцё беларускае.

Унія, стаўшы на грунт народна-беларускі, выганяе з нашага краю маскоўшчыну і не пазваляе ўлазіць польшчыне.

Унія выганяючы маскоўшчыну і бароннячы перад польшчынай, будзе лучыць усіх беларусаў на грунце і народным і рэлігійным і тым самым узмацуе наш нород неразвязным лучнікам і натуральным — народным і наднатуральным — рэлігійным.

Апроч таго, што ўнія нас лучыць і бароніць на нашым унутраным грунце, яна

гэта самае робіць і на грунце міжнародным, бо злучаючы з Апостальскім Пасадам уводзе нас у сям'ю хрысьціянскіх цывілізаваных народаў Эўропы бяз ніякай палітычнай ад іх залежнасьці, так як незалежны ад нікога ёсьць той, каторы стаіць на чале жыцьця рэлігійнага гэтых народаў.

Гэтага-ж мы аб сабе сказаць ня будзем магчы, пакуль будзем рэлігійна падзеляны.

Дзеля гэтага кожны сьведамы народна і рэлігійна Беларус у імя свайго рэлігійнага і народнага Ідэалу павінен унію пашыраць, бо рэлігійнага злучэньня вымагае сама прырода адраджэньня Беларускага Народу.

Г. Стасіла.

Агульная перапісь насельніцтва.

Аб агульнай перапісі насельніцтва, якая адбудзецца 9 сьнежня с. г., мы ўжо пісалі ў прошлым нумары і будзем аб гэтай перапісі пісаць больш.

Агульная перапісь насельніцтва, калі яна будзе праведзена справядліва, будзе мець вялікае значэньне і для нашай справы беларускай. А каб гэная перапісь была праведзена справядліва адносна нас беларусаў, мы павінны ёй зацікавіцца, каб у часе перапісі ня было надужыцьця на шкоду беларускай нацыі. Праўда, у сёлетняй перапісі няма рубрыкі, у якой-бы запісывалася народнасьць, але гэную рубрыку замяняе рубрыка „бацькаўская мова“ ці як абазначана папольску „język ojčysty.“ Вось на гэтую рубрыку беларусы прадусім і павінны зьвярнуць увагу, каб іх мову запісалі беларускай. Пры гэтым не ад рэчы паясьніць і тое, што сьпісывачы мусяць запісываць так, як адкажа на пытаньне запісываны. Апрача гэтага, падаём да ведама, што спісывач ня мае права склікаць да аднае хаты з усяе вёскі і там запісываць, а мусіць заходзіць у кожную хату і так выконываць перапісь.

Вось дзеля гэтага, каб ня была ў сёлетняй перапісі выкарыстана нясьведамасьць часткі нашага сялянства, якое сваю мову беларускую называе мовай „простай,“ якой як такой няма і на сьвеце, сьведамейшыя нацыянальна беларусы павінны загадзя разьясьняць сваім суседзям аб значэньні перапісі і аб тым, што мова, якую нясьведамыя сяляне называюць мовай „простай,“ ёсьць мова беларуская.

Абавязак гэткага раз'ясьненьня бязумоўна ляжыць на сьведамых нацыянальна беларусах.

Пры гэтым трэба сказаць і тое, што кожны сьведамы чалавек мае поўнае права аб перапісі разьясьняць другім і гэтаму ня мае права рабіць перашкодаў паліцыя. Дык разьясьняйма аб значэньні перапісі сваму народу ўсьведамляючы нясьведамых, што няма мовы „простай“ бо наша мова ёсьць беларуская

п—к.

З газэт.

Ангельскія парлемантарысты аб Украінцах. Прасовы бюлетэнь „WU“ (№ 275 (573) падае, што ангельскія парлемантарысты пастар James Barr, Rhyse і G. Dawis, якія нядаўна адведалі ўсходнюю Галіччыну, вярнуўшыся ў Англію выдалі друкам абшырную справаздачу пад загалоўкам „Весткі аб польска-украінскім споры ў Усходняй Галіччыне.“

У гэнай справаздачы, як падае „WU“ апісваецца аб выбарах, споры Украінцаў з Палякамі, аб жыцьці ўкраінцаў і іх палажэньні ў Польшчы. У канцы сваей справаздачы ангельскія парлемантарысты сьцьвярджаюць, што Украінцы зьяўляюцца адным з найбольшых народаў у Эўропе, а Украінцы ў Польшчы — ёсьць найбольшай меншасьцяй у Эўропе.

Папраўка. Украінская газэта „Ніділя“ у нумары 38 (II.X.1931) падае, што ў Навагрудку арыштаваны выдатны беларускі дзеяч Аляксюк і што Аляксюк адыграў вялікую і важную палітычную ролю і за гэта здабыў сярод беларусаў сымпатыю і аўтарытэт. Прычына арышту, як падае „Ніділя“, што Аляксюк быццам агітаваў проціў Польшчы.

Вось-жа дзеля такой нясьцісласьці аб Аляксюку ў зьвязку з арыштам яго мусім вестку „Ніділі“ спраставаць. — У Навагрудку быў арыштаваны адвакат Аляксюк не за палітычную дзейнасьць, а як западозраны ў праступку крымінальнага характару. Аляксюк ніколі ніякае важнае ролі ў беларускай палітыцы на карысьць беларускага народу не адыграў і не заслужыў сярод беларусаў на аўтарытэт. Аляксюк зрабіў на грунце беларускім толькі тое, што запачаткаваў сярод беларусаў лякайскае полёнафільства, па лініі якога пашлі ведамы Паўлюкевіч, Умястоўскі, пасьля іх Луцкевіч і Астроўскі, а цяпер валачэ гэту думку Ф. Акінчыц.

Лістовая тайна. Пад такім загалоўкам „Діло“ (№ 224) зьмяшчае такую вестку: рэдактар украінскай газэты „Свобода“ Б. Цэлевіч выслаў з Львова да д-ра О. Когута (абодва яны быўшыя берасьцейскія вязьні) заказное пісьмо, але д-р Когут атрымаў у канвэрце места пісьма, толькі кавалак чыстае паперы і больш нічога. На канвэрце былі сьляды адчыняньня пісьма. Гэты факт гаворыць сам за сябе.

Wypiswajcie kataloh biełaruskich knih, a z jaho abaznačanyja čyrwonym atramantam

knižki pa tannaj canie!

Biełaruskaja Kniharnia „Pahonia“: Wilnia, Ludwisarskaja wul. Nr. 1.

З Беларускага Жыцьця

Незацьвярджаюць гурткоў Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры. У Навагрудскім ваяводзтве ў апошнія часы пачалі адмаўляцца адміністрацыйныя ўлады легалізаваць новыя гурткі Бел. Інст. Гасп. і Культ. Нядаўна адмовіўся залегалізаваць гурток Б. І. Г. і К. Баранавіцкі староста ў Гайніне, а цяпер адмовіў легалізацыі гуртка ў Дзятлічах староста Навагрудзкі.

Палітычнае выступленьне Бацькаўскага К-ту і Пэд. Рады Навагрудскай Бел. гімназіі.

Віленская польская прэса нядаўна апублікавала, як сэнсацыйную вестку, дэклярацыю Бацькаўскага Камітэту і Пэдагагічнай Рады Навагрудзкай Бел. Гімназіі, падануюдня 2 г. м. навагрудскаму ваяводзе.

Зьмест гэнае дэклярацыі сапраўды сэнсацыйны, бо зьяўляецца адказам на незаданае пытаньне.

Пэдагагічная Рада і Бацькаўскі К-т Навагрудзкай Бел. Гімназіі ў сваей дэклярацыі выражаюць сваю ляяльнасьць да Польшчы; давер да ўраду Польскай Рэспублікі.

Ня думаем, што, каб такой дэкларацыі вымагалі польскія ўлады, бо-ж Навагрудзкая Бел. Гімназія, як інстытуцыя апалітычная, ніколі і нідзе не выяўляла сваэй варожасьці ані да Польскай дзяржавы ані да ўраду. Словам, такое бязсэнсоўнае выступленьне так апалітычнай інстытуцыі, як гімназія, выказываючы свае палітычныя пачуцьці, выглядае вельмі непаважна.

11 угодкі Слуцкага Паўстаньня. Урачыстае сьвяткаваньне 11 угодкаў Слуцкага Паўстаньня мае адбыцца ў Вільні 15 лістапада с. г.

БЕЛАРУСЫ Ў ЛАТВІІ.

Беларускі Народны Тэатр у Рызе. У суботу 10-X, адбылося адкрыцьцё Бел. Народнага Тэатру ў Рызе. Тэатр утрымліваецца Беларускім Тэатральным Т-вам. На адкрыцьці была пастаўлена камэдыя М. Кудзелькі „Мікітаў Лапаць“. Рэжысэрам быў артыст Тэатру Расейскай Драмы І. Дэ Бур. Пьеса, дбайліва і сумленна пастаўленая, прайшла вельмі добра пры ўчасьці многалюднай публікі. Адна бяда, што тэатральны будынак ня мае добрай акустыкі.

З Літоўскаго жыцьця.

З'езды Т-ва Цьвярозасьці. У Незалежнай Літве карысна працуе і разьвіваецца Т-ва Цьвярозасьці. Па ўсім краі мае яно свае аддзелы, праз якія вытрывала змагаецца з п'янствам. Т-ва гэта выдае сваю часопісь „Sargyba“ (Страж), а так-жа розныя адозвы, брашуры і кніжкі зьместу проціалькагольнага. Час-ад-часу ў розных большых местах Літвы адбываюцца зьезды цьвярозьнікаў, на якіх адбываюцца лекцыі і нарады аб змаганьні з п'янствам. Вось-жа гэткі з'езд ар-

W. A.

Adam i Anielka.

XII. U arhanistaha.

Anielka bolš tydnia žyła na kwatery ŭ arhanistaha; stała papraŭlacca. Treba było niejak wyjšci z hetaha pałažeńnia. Užo jany z amerykancam uhawarylisia, što šlub budzie zaraz, jak jana pazdarawieje. Tolki jašče nia było abdumana, hdzie buduć žyć. Usie starańni Amerykanca nia mieli da hetaj pary nijakaha rezultatu; pry hetym usim hrošy było nia lišnie mnoha, kab adrazu zawieści ŭsiu haspadarku, bo i doktar i lakarstwy, a pośle treba sprawić siakoje-takoje adzieńnie, bo Anielka nia mieła pasahu. Z „čornaj knižkaj“ sprawa niejak uładziłasia, bo małady ksiondz i arhanisty pajšli da probašča i skazali wostra: „Kali probašč nia wykasuje Anielki z „čornaj knižki“, dyk my jašče siońnia pajedziem da biskupa z žałabaj“. Probašč kryčaŭ, swaryŭsia, ale bolš Anielki nia wyklikaŭ z ambony. Sprawa zaciorłasia, pajšła ŭniepamiać, tymbolš, što ŭsie wiedali, jaki machlar dziadźka Anielčyn. Anielka ŭspakoiłasia, tolki wiasiołaści kryšku mienš pakazywała. Dumała jana, ci pajšci da dziadźki pośle ŭsiaho hetaha. Pastanawiła paradzicca sa staroj Ahataj, akurat siahońnia wiečaram jana maniłasia pryjšci. Ahata pryniasła nawiny.

— Pastyr, wun toj, što biaz ruki, dačuŭsia ab wašych sprečkach z dziadźkam, dyk anahdaj wiečaram pytajecca twajho dziadźku: „ci ty, kaža,. dawaŭ swajmu synu hrošy na cukierki?“ Dziadźka kaža:

— Nie, nie dawaŭ. — Tut zaraz pačuli susiedzi, stali pytacca: „Što, jakija hrošy?“ A pastyr kaža:

— Bačycie, wun jak było: jaho syn, jak jon?... aha, Kastuś, adpasywaŭ u mianie kalejku; hladžu ja, jon niešta chawaje, smokča. Ja pytajusia: „što ty maješ?“ Jon nia choča pryznacca. Dyk pastuchi jaho zławili, dy znajšli całuju skrynačku cukierkaŭ, dy jašče cały rubiel byŭ u jaho za pazuchaj“.

Susiedzi, značycca, stali na dziadźku swarycca za tuju napaść na ciabie, a jon, kab jon być nia wiedaŭ, kaža: „aha, ja daŭ swajmu Kastusiu hrošy, haścinca pośle kirmašu“. Dyk susiedzi ŭ śmiech, a dziadźka, značycca, twoj, kali nie zaklanie, dyk až strach i pajšoŭ da chaty.

— Ja adrazu kazaŭ, što heta Šlomawa rabota! — ŭskryknuŭ arhanisty, katory pačuŭ z bakoŭki ab hetaj historyi.

Pryšoŭ i Amerykaniec, Ahata zaraz i jamu raskazała, jak dziadźkaŭ Kastuś ukraŭ tyja niaščasnyja hrošy, dy ŭsie zanios Šlomie za cukierki, a tolki adzin rubiel astaŭsia. Usie hawaryli, śmiajalisia, žartawali; nareščie arhanisty kaža:

— Što-ž, zapjom zaručyny! — wyciahnuŭ butelku wina i pasłaŭ niekudy słužanku, niešta našaptaŭšy joj na wucha, tolki było čuwać:

— ...Ale kažy, kab biez adkazu, kaniečnie.

Pakul šykawalisia čarki i zakuski, uwachodzić małady ksiondz.

— Što wy heta wyrablajecie?

— Zaručyny budziem pić, prosim u kumpaniju, — žartawaŭ arhanisty.

— A ja dumaŭ, što ważniejšaje ŭ was, dumaju, niaščaście, ci što jakoje, što tak biespramienna zaklikajecie — hawaryŭ ksiondz, zasiadajučy pry stale.

Raskazali nawinu ab hrašach i cukierkach.

— Och, hetyja žydy psujuć nam dziaciej i pryčyniajuć ludziam niaščaście. A hety Šloma, dyk najhoršy kruciel.

Zasieli.

— Ciapier na pawinšawańnie ja chacieŭ-by skazać niekalki słoŭ, — pačaŭ ksiondz.

Maładaja Para! Waša dola — heta dola całaha našaha narodu. Ciemnata i niaświedamaść zabiwajuć dušu narodu, choć jon i dobry, ale ślapy i darohi nia bačyć. Apiakuny-susiedzi, zamiest pakazać nam praŭdu, śmiajucca z nas i kryŭdziać. Jość jašče horšyja, bo ckujuć nas adnaho na druhoha, kab my sami siabie zajadali, a jany, kab panawali nad nami. Tolki-ž hetak nia budzie: Maci naša, Biełaruskaja ziamlica, pa-

ганізуецца 25 і 26 гэт. мес. у Паневежы, 1 лістапада ў Тэльшах і 9 лістапада ў Коўне.

Выстаўка дробнай гаспадаркі адбылася ў Коўне 4 гэт. мес. На выстаўцы гэтай многія арганізацыі дробнай гаспадаркі назвалі сваей гадоўлі: птушкі, дробную жывёліну, плады садоў, гародніны, тытун і розныя інш. Выстаўку адчыніў міністар гаспадаркі Алекса адпаведнай прамовай, у якой падчоркнуў, што многія здабыткі дробнай літоўскай гаспадаркі зьяўляюцца сяньня добрым таварам не толькі ў краі, але і заграніцай.

Лік студэнтаў павялічваецца. Сёлета ў Ковенскім Унівэрсытэце ім. Вітаўта Вялікага лік студэнтаў значна павялічыўся. На пачатку акадэміцкага году новых паданьняў аб прыняцьці было зложана 1505. Найбольш ахвотнікаў на права і мэдыцыну. Сярод паступаючых вялікі лік дзяўчат.

Заканчэньне Кангрэсу „Саюзу асвабадженьня Вільні" адбылося 6 гэтага месяца. На кангрэсе было 200 дэлегатаў. Старшыня Саюзу праф. М. Біржышка меў рэфэрат, у якім прадставіўшы палажэньне літоўцаў і іншых народнасьцяў у Польшчы, заклікаў сяброў да энэргічнай працы дзеля зьдзейсьненьня мэтаў саюзу.

У Коўні будзе хутка выданы вялікі альбом на памяць 500 летняга Вітаўтаўскага юбілею. Альбом гэты будзе выданы на прыгожай паперы вялікага фармату і будзе мець больш тысячы розных фатаграфіяў. Альбом выйдзе на пачатку будучага году.

З заграніцы.

Неафіцыяльная вайна на Далёкім Усходзе. Пасьля падпісаньня пакту Кэльлёга, датрыманьня забавязаньняў якога сьцеражэ саюз дзяржаў — Ліга Народаў, афіцыяльная вайна проста немагчымая. Дзеля гэтага цяпер вядзецца вайна на Далёкім Усходзе не афіцыяльна. Гэную неафіцыяльную вайну, як мы ўжо падавалі, начала Японія супроць Кітайшчыны. Японія нагла і неспадзявана, без аб'яўленьня вайны, напала на Кітайшчыну і заняла частку Манджурыі. Увесь сьвет закрычэў: — нарушэньне міжнародных дагавораў! Японія зламала міжнароднае забавязаньне! Пачалася дыскусія. Адны цьвердзяць, што Японія зламала міжнароднае права аб вайне, а другія даказваюць, што Японія гэтага права не парушыла. Калі пакрыўджаная Кітайшчына патрэбавала ад Лігі Народаў абароны міжнароднага права аб ненападаньні, якое забавязаньне падпісаўшы і Японія, Японскі ўрад заявіў, што і ён стаіць проціў вайны, а ў Манджурыі напаў на Кітайшчыну збунтаваўшыся Японскі генерал і вядзе вайну з Кітайшчынай „на сваю руку".

Як выглядае гэты „бунт" генэрала, мы ведаем з нашага гістарычнага перажытку і ён высьняецца з становішча і адносінаў да гэнай неафіцыяльнай вайны афіцыяльнымі пастановамі Японскага ўраду.

Японія, якая на міжнароднай арэне заяўляе, што і яна працівіцца вайне і адначасна вядзе вайну „збунтаванымі" генераламі, каб выкруціцца ад інтэрвэнцыі Зл. Шт. Амэрыкі і Лігі Народаў, заяўляе, што яна адкіне ўсялякія інтэрвэнцыі ў гэтай справе і будзе імкнуцца да таго, каб японска - кітайскі спор зьліквідаваць дагаворамі зацікаўленых у гэтым споры старон.

Які гэта мае быць дагавор зацікаўленых старон, хіба кожнаму зразумела, калі возьмем пад увагу факт паўстаньня ў Манджурыі незалежнага ўраду, аб якім мы ўжо пісалі і які начаў перэгаворы з Японіей.

Паўстаньне на Каўказе. Газэты падаюць, што ў Грузіі на Каўказе выбухнула паўстаньне процiў камуністычнай улады. Паводле гэных вестак, люднасьць Азэрбэйджану і Армэніі выганяе з краю камуністычную ўладу і камуністаў. Бальшавіцкае войска пераходзіць да паўстанцаў з аружжам і змагаецца з камуністамі. Вялікая частка Азэрбэйджану знаходзіцца ў руках паўстанцаў.

Спробы бальшавікоў накланіць паўстанцаў да перагавораў, паўстанцамі адкінуты. Бой паўстанцаў з камуністамі бяцьцам прадаўжаецца.

Новыя выбары ў Англіі. У мінулым тыдні ў Англіі развязаны дасюлешні парлямант і вызначаны новыя выбары. Многія палітыкі спадзяюцца вялікай пэратасоўкі ў ангельскай палітыцы пасьля гэтых выбараў.

Адстаўка дасюлешняга ўраду ў Нямеччыне. Гэтымі днямі нямецкі ўрад, які рабіў крокі дзеля зьбліжэньня з Францыяй падаўся ў адстаўку. Новы ўрад пакульшто яшчэ не ўтварыўся.

Дыктатура ў Югаславіі на шляху да ўпадку. У Югаславіі разьвіваюцца падзеі менш - больш таксама, як у Гішпаніі. Дыктатура давяла дзяржаўную гаспадарку да руіны ці, як цяпер модна называюць, да крызісу і пасьля хацела ўзлажыць усю за гэта адказнасьць на паслухмяны парлямант, але апазыцыя збайкатавала выбары і пасьля гэтага прышла рэвалюцыя; амаль тое самае робіцца цяпер і ў Югаславіі.

Каб пералажыць з сваіх плячэй адказнасьць, кароль загадаў выбары парляманту. Распісаны выбары і то яўныя, каб можна было выбраць лагодны і пакорны, як ягнятка, каралю парлямант. Але апазыцыя, як мы ўжо падавалі, гэтыя выбары збайкатавала. У Югаславіі падзеі разьвіваюцца на такой самай лініі, як нядаўна разьвіваліся ў Гішпаніі, дзе дайшло да рэвалюцыі.

З Польшчы.

Праца Сойму і Сэнату. Сойм пасьпешна і даволі бурліва разглядае ўрадавыя праекты законаў. Дзеля таго, што ў сучасным Сойме большасьць паслоў партыі Б. Б., якая патрымлівае ўрад, урадавыя праекты пeратвараюцца на абавязуючыя законы, як у гарачай печы з цеста blінкі. Сярод гэтых многіх законаў ёсьць і законы, якія абцяжываюць грамадзян новымі падаткамі.

Гэтыя сьвежа сьпечаныя ў соймавай печы законы, каб можна было іх перадаць да выкананьня, паводле правіла канстытуцыі мусяць быць пацьверджаны і Сэнатам. Але, як ведама, і ў Сэнаце ўрадавая партыя Б.Б. мае большасьць, дык жыцьцё гэтых новых законаў амаль сусім пэўнае.

Адкрыцьце тайнай друкарні і арышт 200 камуністаў. Надовячы паліцыя ў Варшаве натрапіла на тайную друкарню, якая друкавала камуністычныя праклямацыі і брашуры. Устройства гэнае друкарні проста чудовае тэхнікі, аб якой у Польшчы яшчэ і ня чулі. У друкарні знойдзена мноства надрукаваных праклямацыяў і брашур камуністычнага зьместу.

Пры гэтым паліцыя арыштавала каля 200 асоб камуністаў.

Банкруцтва варшаўскіх прамысловых фірмаў. У апошнія часы ў Варшаве збанкрутавала 7 вялікіх фірмаў, 6 фірмаў зажадала судовага нагляду, 3 фірмы пачалі дабравольна ліквідавацца, 4 фірмы пачалі ўгадова разьлічацца з сваімі даўжнікамі.

Банкрутуе ў Польшчы і савецкі гандаль. Бальшавікі, як ведама, аткрылі ў Польшчы свае гандлёвае прадстаўніцтва. Цяпер ходзяць чуткі, што з прычыны гаспадарчага крызісу ў Польшчы, які вельмі моцна прыціснуў гандлёвыя фірмы ў Варшаве і Лодзі, з якімі бальшавікі вялі гандлёвыя транзакцыі, бальшавікі страцяць да 200.000 доляраў. Кажуць, што дзеля гэтага бальшавікі думаюць сусім закрыць свае гандлёвае прадстаўніцтва ў Польшчы.

Страшнае спусташэньне ад выбуху газу. Надовячы ў Гдыні, у новапабудованым польскім порце здарыўся страшны выбух сьвятлянага газу. Гэны выбух нарабіў шмат шкоды. Ёсьць забітыя і раненыя людзі.

Да нас пішуць.

ЭЎХАРЫСТЫЧНЫ КАНГРЭС І ДЭМОНСТРАЦЫЯ ВЕРУЮЧЫХ.

Слонім. Кругом каля Слоніма жывуць беларусы. У Слоніме так-жа многа беларусаў. Тут каля нас многа беларусаў праваслаўных, але ня мала ёсьць і беларусаў каталікоў. Каталікі беларусы неяк глыбей веруючыя ад праваслаўных. Праваслаўнае расейскае духавенства вельмі слабы ўплыў праяўляе на народ; не праяўляюць уплыву на народ і польскія ксяндзы, але як вышэй сказана, беларусы каталікі неяк глыбей веруючыя.

Палякоў у нашых ваколіцах вельмі мала. Некалькі дзесяткаў абшарнікаў, са дзьве сотні асаднікаў і ўрадоўцы. Палякі ўсе каталікі.

Сёлета 13 мін. м. адбыўся ў нас Эўхарыстычны Кангрэс. На гэты кангрэс прыяжджалі арцыбіскуп Ялбжыкоўскі і біскуп Бандурскі, зьехалася і шмат паноў. Веруючыя беларусы каталікі шчыльна запоўнілі ўвесь Слонім. Нямала зышлося дзеля цікавасьці і беларусаў праваслаўных. Тысячныя масы беларускага сялянства запоўнілі ўсе вуліцы Слоніма. Гутаркі пабеларуску гэнага натоўпу зьліваліся ў адзін гоман і гінулі ў прасторах зямной паверхні.

Кангрэс адбываўся папольску; аб чым там гаварылі ня ўсе ўчасьнікі зразумелі і ня вельмі гэтымі прамовамі цікавіліся. У касьцёлах падчас казаньняў папольску, так як і заўсёды, бабулькі драмалі, а мужчыны пазявалі, чакаючы заканчэньня казаньня, бо за прадчасны выхад з касьцёла крычаць на іх жонкі і маткі. Словам, Эўхарыстычны Кангрэс нічога новага не завёў; як адбываецца ў нас заўсёды папольску ў касьцёлах навучаньне людзей Праўды Божай, тое самае было і падчас Кангрэсу. Каб гэткі кангрэс ды нешта ўзбудзіў у душы нашага селяніна, або паглыбіў веру ў яго паняцьці, спадзявацца ня прыходзіцца і трэба задаволіцца падсьведамай дэманстрацыяй веруючых, каторым само вераваньне трэба яшчэ паглыбляць і раз'ясьняць сутнасьць справы рэлігіі. Пакуль беларусам будзе прыходзіцца падчас казаньняў у касьцеле драмаць, або пазяваць, чакаючы „калі ён конча там нешта гаварыць", датуль беларусы ня змогуць зразумець сутнасьці рэлігіі. А каб беларускія бабулькі не драмалі падчас казаньняў, а мужчыны не пазявалі, трэба прамаўляць да іх у зразумелай мове — пабеларуску.

В.

čynaje radzić dziaciej lepšych, katoryja, sami paznaŭšy praŭdu, biarucca praświečywać bratoŭ ciomnych. Budzie nam ciažka, bo paŭstanuć prociŭ nas nawiet rodnyja braty, abo i baćki našy, ale heta ničoha. Zaświecić i dla nas jasnaje soniejka, niemaraść adstupić i „budzie ŭnukaŭ panawańnie tam, hdzie siahońnia płača dzied".

Woś-ža i wy, maładyja maje druhi, pierajšli Wy ŭžo ciarnistuju darohu, dy jana i niaskončana, ale tyki-ž jasnaja nadzieja i Wam świecić siahońnia. Tolki-ž nia treba sumlawacca: žyćcio — heta wajna, boj haračy; treba zmahacca z niadolaj, pracawać biez adpačynku, tahdy dola pryjdzie sama ŭ chatu. Wašaja siaŭba była ŭ płačy i trywozie, ale žniwo budzie wiasiołaje: daść Wam Boh Swajo bahasławienstwa, a jano lepšaje budzie, jak ciomnych baćkoŭ i familjataŭ, — ja pierakanany, što Boh Wam budzie bahasławić i ŭ haspadarcy, i ŭ zdaroŭi, i ŭ dzieciach i ŭ nukach.

Amerykaniec staŭ dziakawać.

— Dziakuju ksiandzu za pawinšawańnie, a jašče bolš za apieku i ratunak i za dobryja słowy. U Amerycy haworać: „čas — heta hrošy". Tyki i praŭda, bo čaławiek pracawity i abučany moža zdabyć hrošy i dolu. U našym krai tutaka ciažej ludziam žyć, bo tut usio ciomnyja ludzi. Adnak u pociemkach zapaliwajuć lampu, kab było świetła, dyk i ŭ nas maładyja ludzi stali zapaliwać światło i świacić ciomnamu narodu. Dziakuj Bohu! Ja ab Biełarusi čuŭ jašče ŭ Amerycy, choć, pryznacca, tolki ad našaha ksiandza paznaŭ, što ja sam Biełarus i hetaha ŭžo stydacca nia budu, bo tolki podłyja, abo durnyja ludzi stydajucca swajho narodu. Dyk niachaj naš małady ksiondz žywie na doŭhija lety!

— Plurimos annos!*) — kryknuŭ arhanisty.

Wypili.

— Jašče i mnie treba štokolečy skazać, hawaryŭ arhanisty. — Widzicie, ab hetaj Biełarusi ja niejak sumlawaŭsia i, praŭdu skazać, na ksiandza byŭ krywy spačatku. Dumaŭ ja sabie, „što heta jamu zrabiłasia"? A pośle ja pamiarkawaŭ: „moža i praŭda?" Hladžu: ludzi tut ubirajucca ŭ biełuju adziežu, a wałasy majuć rusyja, jak i naša Anielka, wot i hatoŭ „biełarus". A moj baćka jnakš nia wychodziŭ, bywała, z chaty, jak u biełym. Bywała, idzie za sachoju bieleńki, jak hałubok, až radaść hlanuć, a jon hare... hare. Ale, što ja kazaŭ? Ahata, kab ty być nia wiedała, ab čym ja hawaryŭ?

— Boh ciabie wiedaje, moj ty hałubok?

— Ale... hałubok, moj baćka, značyć. Dyk i Wy, dwoje hałubkoŭ, žywicie zhodna, lubiciesia, a na złość „čornaj knižcy" my budziem usie Biełarusy!

Budziem, budziem! — usie śmiajalisia.

*) Mnohija lety!

АДОЗВА

ГРАМАДЗЯНЕ!

Цяжкі іспыт выпаў на долю беларускага і ўкраінскага народаў. Змаганьне за нацыянальнае вызваленьне і лепшую будучыню пацягнулі за сабой многа ахвяр. Моладзь кідала школы і складала на аўтар бацькаўшчыны свае жыцьцё. Палітычныя абставіны на ўсіх землях Беларусі і Украіны змусілі шмат - каго пакінуць свой родны край. Паўстала масавая эміграцыя, значную частку якой складала моладзь, што ня мела закончанае асьветы. Найбольшым культурным асяродкам беларускай і украінскай эміграцыі зьяўляецца Чэхаславаччына, дзе эміграцыя сустрачае шчырае прыняцьце. За братнюю дапамогаю Чэхаславацкага народу былі заснаваны ўкраінскія высокія школы — Украінскі Унівэрсытэт у Празе, Украінская Гаспадарчая Акадэмія ў Падэбрадах, Украінскі Пэдагагічны Інстытут у Празе.

Для асоб, якія перарвалі сваю сярэднюю асьвету ў выніку вызвальнага змаганьня, было заснавана дзе - колькі матуральных курсаў; была заснавана украінская гімназія. Закончыўшым сярэднюю асьвету была дадзена магчымасьць паступаць у чэхаславацкія высокія школы. Нямаетныя студэнты — беларусы і украінцы — дасталі стыпэндыі для студыяў.

Такім чынам да канца 1930 году атрымалі дыплёмы дахтароў ды інжынэраў розных фахаў каля 2.000 беларусаў ды украінцаў.

Беларускі ды украінскі народы, дзякуючы шчодрай дапамозе братняга Чэхаславацкага народу, узбагаціліся на 2.000 высока кваліфікаваных культурных працаўнікоў, якіх так нехапала пад час актыўнага вызвальнага змаганьня.

Цяпер гэта дапамаговая акцыя спыняецца.

Але ня спыняецца прыплыў беларускіх і украінскіх студэнтаў да Прагі, куды іх штурхаюць неспрыяцьлівыя абставіны ў краі, асабліва за апошні час.

Цяжка студэнту адначасна вучыцца і зарабляць сабе на кусок хлеба. А пры сучасным агульным гаспадарчым крызісе гэта ёсць проста немагчыма. І перад студэнтам узьнікае адзіны выхад: пакінуць высокую школу на парозе яе закончаньня.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Падтрымайце студэнта ў гэту цяжкую хвіліну яго жыцьця. Дайце яму магчымасьць закончыць фаховую асьвету.

Перад двумя гадамі самі студэнты заснавалі дапамаговы фонд у Празе з дабравольных складак студэнтаў. Але коштаў, якія былі за гэты час сабраны, не выстарчае на задаволяньне самых няўхільных вымогаў. Патрэбны пэўныя, сталыя крыніцы, з якіх-бы маглі чэрпацца матарыяльныя сродкі.

Моладзь зьвярнулася да старэйшага беларускага і украінскага грамадзянства, асабліва да прафэсуры ў Ч.—С. Р., каб агульнымі сіламі стварыць арганізацыю, якая б мела за мэту дапамогу студэнтству.

Змаганьне проці супольных ворагаў за тыя самыя ідэалы, супольная гістарычная доля беларускага і украінскага народаў прадыктавалі адной супольнай апалітычнай дапамаговай арганізацыі—„Дапамаговага фонду украінскіх і беларускіх студэнтаў у Празе", арганізацыі, легалізаванай чэхаславацкай уладаю. Управа Фонду складаецца з беларусаў і украінцаў. На чале дапамаговага фонду стаіць акадэмік прафэсар Д-р Станіслав Дністрянський (украінец) а намесьнік старшыні фонду грамадзянін Васіль Захарка (беларус).

ГРАМАДЗЯНЕ!

Уступайце ў члены фонду! Спрычыняцеся да стварэньня кадраў уласнае фаховае інтэлігэнцыі. Ад вас залежыць істнаваньне фонду, бо фонд разрахоўвае толькі на самаападаткаваньне беларускага ды украінскага грамадзянства.

Беларускія ды украінскія арганізацыі, прадпрыемствы і таварыствы, запісывайцеся членамі фонду!

Чым больш членаў фонду, тым больш дапамогаў для незаможных беларускіх ды украінскіх студэнтаў. Ад вас залежыць колькасьць закончыўшых высокія школы!

Уступайце ў члены фонду!

Членская складка толькі 60 корон чэхаславацкіх у год, або 5 корон месячна.

Член-фундатар—200 корон.

Складайце ахвяры на Дапамаговы Фонд!

Адрэс Дапамаговага Фонду: Prof. D-r St. Dnistrjanskyj. Praha XIX, Jiraskova, 472-III, Tchécoslovaquie.

Грошы пасылайце: Рэд. і Адм. „Беларуская Крыніца", Вільня, Людвісарская 1—19.

У Празе, чэрвень 1931 году.

Дапамаговы Фонд Украінскіх і Беларускіх Студентаў у Празе

Проф. Д-р *Станіслав Дністряньскій*,
Старшыня Фонду.

Васіль Захарка,
Намесьнік старшыні Фонду.

Д-р *Володимир Гайдовський-Потапович*,
Пісар Фонду.

Юрій Добриловський
Скарбник Фонду.

Ab haspadarcy.

Pierachavańnie jabłykaŭ.

Najlepšaja jabłynia rodzić tolki raz za hod, dyk treba heta naležna vykarystać, treba zimovyja sarty jabłykaŭ dobra pierachovyvać. Usia biada naša ŭ tym, što my hetaha abo nia ŭmiejem, abo, što jašče horš, — umieć nia chočam. Niachočačaha nichto nie navučyć, a dla niaŭmiejučaha, ale chočučaha praznačany hetyja lohka vykanalnyja rady.

Jabłyk, praznačany da zimavańnia, musić być całkom zdarovy, nierabačlivy i nieababity: jaho treba abirać z dreva abo rukami, abo adumysłovymi ščypcami na doŭhich šastoch. Da pierachavańnia niapryhodna sadovina (jabłyk, ihruška) apaŭšaja, abo tymbolš stresienaja. Sadovina, praznačanaja da sušeńnia, musić być suchaja.

Pamieškańnie, kudy majucca być jabłyki składanymi, musić być suchim i zabiaśpiečanym ad marazoŭ. Samuju sadovinu najlepš układać adzinočnymi słajami na dzieraŭlanych palicach, zroblenych z doščak, abo z uzdoŭž pałožanych cieńkich šastoŭ (tyčak, pryviazak). Hetak ułožanyja jabłyki treba čas ad času pierahladać i papsavanyja abo tolki majučyja nachił da psavańnia — prymać.

Lepšyja sarty jabłykaŭ zapakovyvajucca ŭ čystyja bočki, abo tolki ŭ karziny, ci košyki. Kožny jabłyk (ihruška) asobna ŭkručyvajecca pry hetym u čystuju (niapisanuju i niadrukavanuju) papieru i ŭkładajecca słajami. Hetyja słai (płasty) jabłykaŭ (ihrušak) pierakładajuć sienam, abo aŭsiankaj. — Užyvajecca taksama dla pierasypańnia pierachovyvanych jabłykaŭ i miakina, asabliva pry mienš važnych sartoch, pry katorych kožny jabłyk paasobku ŭ papieru nie zakručyvajecca.

Dla pierasyłki sadoviny čyhunkaj, składajuć jaje, pierakładajučy sienam, miakinaj i inš., u karziny, abo ŭ plecienyja z łazy, ci viarby košyki i abšyvajuć ich zvierchu (zamiest vieka) čystaj hruboj zrebninaj. — Mienš užyvajucca da pierasyłki sadoviny źbityja z doščak — zvyčajna z apołkaŭ — adumysnyja skryni (paki): jany adnak niaščylnyja i za ciažkija i tamu ŭžyvajucca davoli redka.

Kvašeńnie kapusty.

Čym dalej, tym bolej pačynajuć ludzi pierakonyvacca ab važnaści dla zdaroŭja čałavieka ŭsiakaj haspadarskaj sadoviny, a pieradusim — kapusty. Asabliva važnaj jość u haspadarcy — i naahuł u siam'i — kapusta dobra zakvašanaja.

Jakaść kvašanaj kapusty zaležyć: 1. ad hatunku samaj kapusty, 2. ad jakaści bočki, u katoraj kapusta zakvašyvajecca 3. ad umiełaj pracy pry zakvašyvańni kapusty i 4. ad sposabu trymańnia zakvašanaj kapusty. Zastanovimsia-ž tut koratka nad usim pa kalei.

1. Kapusta vybranaja da kvašeńnia musić być sałodkaj, musić mieć u sabie peŭnuju kolkaść cukru, katorym kormiacca bakteryi małočnaha kvašeńnia. A na prysutnaści i mahutnym raźvićci hetych bakteryjaŭ, jak i samaha małočnaha kvašeńnia, haspadyni musić vielmi zaležyć, bo nia što inšaje, jak heta imienna kvašeńnie konservuje zakvašanuju kapústu i robić jaje nia tolki smačnaj i pachučaj, ale i vielmi zdarovaj. I kali-b z niejkich pryčyn małočnaje kvašeńnie prypyniłasia, dyk nastupaje kvašeńnie actavoje, jakoje psuje ŭsiu spravu biespavarotna. Dziela hetaha, kali-b byŭ sumliŭ, što kapusta branaja da zakvašyvańnia maje zamała cukru, dyk jej treba hetaha cukru dadać, dasypać, abo choć-by dalić dobraha kvasnaha małaka, ci ŭreščie samaj tolki syravatki.

2. Druhoj važnaj spravaj jość vybar bočki dla samoha kvašeńnia. Takaja bočka musić być biazumoŭna čystaj i pa mahčymaści novaj. A heta dziela taho, što ŭ boččy, u katoraj užo niešta było, zvyčajna ŭžo siadziać mocna zahniaździŭšysia bakteryi actovaha kvašeńnia i nie pazvolać raźvicca kvašeśniu małočnamu i jahonym bakteryjam.

Dziela hetata da kvašeńnia hapusty najlepš užyć novych bočak i tolki kali-b ŭžo ich sapraŭdy nielha było čamuści mieć, prychodzicca brać bočki ŭžyvanyja (ale nie staryja!) i ich adpaviedna da kvašeńnia pryhatavać. Robicca heta tak: nasampierš takija bočki musiać być z piaskom dobra vyšaravanyja, asabliva kala pazoŭ. Paśla takaja bočka vymočyvajecca tak doŭha, až pakul vylivanaja kožnych 12 hadzin vada budzie susiom čystaja i nia budzie mieć anijakaha zapachu. Vymačanuju bočku treba vyparyvać i jana tady ŭžo hatova da ŭžytku.

Z novymi bočkami treba pastupać padobna, tolki što ŭ ich heta praca robicca chutka i lohka.

Dalej idzie pryhatavańnie kapusty i samaje nakładańnie jaje. Postup pracy bolš mienš hetaki: vybranyja da kvašeńnia hałoŭki kapusty, ćviordyja i zdarovyja, pierad usim „bielacca", h. zn. składajucca na taku ŭ humnie, abo ŭ inšym miejscy, na nievialikuju hramadu i nakryvajucca pościałkaj, miachami, abo sałomaj (čystaj i zdarovaj!) i lažać tak z tydzień času. Paśla złožanaja kapusta adkryvajecca, staranna ačyščajecca, adrazajucca kačany, sami hałoŭki razrazajucca na pałavinu i šatkujucca.

Šatkavać treba kapustu prad samym nałažeńniem jaje ŭ bočku. Na dno bočki kładucca čystyja, całyja kapuścianyja listy i na ich užo nasypajecca kapusta šatkavanaja, pierasypajecca sollu, a chto lubić — i kminam. Na kožnyja 10 kg (25 funtaŭ) šatkavanaj kapusty sypicca 100g (1/4 funta) soli. Hetak nasypanaja płastami kapusta staranna ŭbivajecca šyrokimi taŭkačami tak doŭha, až pakul z kapusty nia vystupić sobski sok.

Kali bočka ŭžo zapoŭniena dobra ŭbitaj šatkavanaj kapustaj da samaha vierchu, tady na šatkavanuju kapustu kładucca ŭznoŭ vialikija całyja listy kapusty, na ich — kavałak hruboj, ale čystaj i niefarbavanaj (biełaj) tkaniny (zrebniny) i na jaje — čystaje h. zv. falšyvaje dno (dobra da siabie prylahajučyja i ŭvieś vierch złožanaj kapusty prykryvajučyja doški). Heta dno naciskajecca čystymi kamieńniami, ahulny ciažar katorych spačatku nie patrabuje być lišnie vialikim.

Vystupajučuju vyšej fałšyvaha dna kapuścianuju vadu treba źlivać jak padčas samoha kvašeńnia kapusty, tak i paśla, kali kapusta ŭžo kvasnaja. Zaŭsiady adnak krycha takoj vady nad kapustaju być musić.

Pryhatavanaja da kvašeńnia bočka z kapustaj staŭlajecca ŭ čystaje, niamajučaje nijakaha zapachu pamiaščeńnie. Temperatura ŭ takim pamiaščeńni musić być davoli vysokaja, bo až 18-20°C, temperatura ciopłaj chaty).

4. Pa skončańni kvašeńnia bočka z kapustaj pieranosicca ŭ pamiaščeńnie ciomnaje i zimnoje, a na falšyvaje dno dadajecca bolš kamieńniaŭ.

inž. A. K.

З Краю.

Войт і сэквэстратар запёрты ў хлеў.

У засьценку Карклiно, Рымшанскай гм. Браслаўскага пав. нядаўна здарыўся вось такі выпадак:

Войт з сэквэстратарам хацелі апісаць у С. Родзевічавай за падаткі жывёлу. Родзевічава з дочкамі спраціваліся. Да калатні далучыліся жыхары суседняй вёскі і доўга ня думаючы, запёрлі войта з сэквэстратарам у хлеў і заявілі, што ня выпусьцяць пакуль яны не адракуцца апісываць быдла.

Вызваляць „пленных" прыбыла паліцыя, супроць якой паўсталі сяляне. У часе спрэчкі Родзевічыха ранена штыхом у руку.

Паліцыя выклікаўшы ў помач большую сілу з пастарунку звольніла з хлява войта і сэквэстратара.

У гэтай справе арыштаваны 4 асобы.

Арышты. Надовячы паліцыя даканала арыштаў у Зах. Беларусі ў ваяводзтвах: Віленскім, Навагрудзкім і Беластоцкім. Газэты падаюць, што гэтымі арыштамі зьліквідавана некалька камуністычных ячэяк і 2
раённыя камітэты К. П. З. Б. Агулам арыштавана 145 асоб.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.